# ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.
3
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 12 (1276)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### ПЕРАХОДНЫ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

**Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў уручаны Белдзяржуніверсітэту імя У. І. Леніна за лепшыя вынікі ў сацыялістычным спаборніцтве за 1979 год. Урачысты сход, прысвечаны гэтай падзеі, адбыўся ў Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ільіча.**

### ПЫТАННІ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

**абмяркоўваліся на апошнім пасяджэнні парткома універсітэта. З уступным словам перад прысутнымі выступіў прарэктар А. С. Фядэнка.**

**На пасяджэнні прысутнічалі дэканы і сакратары партбюро факультэтаў. Абмеркаванне прайшло ў атмасферы дзелавітасці і высокай патрабавальнасці.**

### ВЫНІКІ ДАСЛЕДЧАЙ

**работы за 1979 год і задачы па павышэнню яе эфектыўнасці разглядаліся на апошнім пасяджэнні вучонага савета універсітэта. Па гэтаму пытанню прысутныя заслухалі справаздачу прарэктара па навуковай рабоце дацэнта І. П. Зяцькова.**

### КОЖНАЕ ПАКАЛЕННЕ

**пісьменнікаў звяртаецца да ленінскай тэмы. «Ісці раіцца, ісці на шчырую споведзь да Леніна»,— гэта стала душэўным абавязкам і патрэбай нашага сучасніка.**

**Размова пра беларускую літаратурную Ленініяну, пра яе вытокі, традыцыі, тэндэнцыі развіцця адбылася на факультэце журналістыкі. Гасцямі студэнтаў былі вядомы крытык Уладзімір Гніламёдаў і лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі паэт Генадзь Бураўкін, аўтар цікавай паэмы «Ленін думае пра Беларусь», радкі якой гучалі на сустрэчы.**

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ



Выдатніца вучобы студэнтка хімфака Т. Мазоль.
Фота М. Дубовіна.

НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

## СУСТРЭЧА ПАКАЛЕННЯЎ

ПА СЛАЎНАЙ, добрай традыцыі ў каторы ўжо раз сабраў філфак былых сваіх выпускнікоў. Тых, хто дзесяць, дваццаць, а то і трыццаць год назад выбраў прафесію філолага. Побач з маладымі дзяўчатамі, учарашнімі студэнткамі, бачыш ужо сталых жанчын, якія некалі стаялі ля вытокаў філалагічнай навукі на Беларусі. Хто прыйшоў на сустрэчу ўсіх пакаленняў ужо не першы раз, а хто ўпершыню... Жарты, смех, першыя пытанні, воклічы здзіўлення напаўнялі актавую залу...

— Ой, дзяўчаты, глядзіце, дык гэта ж Люда Крошкіна,— паказваючы на жанчыну ў зале, сказала Ларыса Фядосава, выкладчыца Бабруйскага механіка-тэхналагічнага тэхнікума.

— І праўда яна. Колькі ж мы не бачыліся? Дзесяць год... Неяк зусім непрыкметна праляцелі яны,— Валянціна Сабранава, старшы рэдактар таварыства «Веды» сумна ўсміхнулася...

— А вось і я. Што, не пазнаяце? — Наталля Карманская, выкладчыца школы № 54 горада Мінска, далучылася да аднакурсніц. Жанчыны абступілі яе, пачалася размова... Гэта сустрэліся разам выпускнікі 1970 года. Так, прыкладна, адбываліся і сустрэчы другіх выпускнікоў. Кожны новы аднакурснік сустракаўся жартамі і ўсмешкай. Усім хацелася зноў адчуць сябе маладымі і вясёлымі студэнтамі філфака...

А потым у актавай зале сабраліся ўсе, каго хвалюе пытанне ўзаемасувязі школы і ВНУ. Абмеркаванне адкрыў дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк:

— У цяперашні час па шэрагу прычын знізілася колькасць паступаючых на філфак, і гэта не можа не хваляваць. Мы хочам паставіць перад вамі задачу выхавання будучых студэнтаў філфака. Будучыя вашы выпускнікі стануць нашымі студэнтамі, а выпускнікі філфака вашымі калегамі па працы...

— Так, — далучыўся да выступлення дэкана член Саюза пісьменнікаў БССР В. У. Верамейчык,— гэта пытанне хвалюе многіх. І я лічу, мы павінны запэўніць дэканат філфака, што кожны выпускнік павінен накіраваць хаця б аднаго свайго вучня на факультэт.

Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМБ А. І. Бутэвіч, дырэктар Мінскай школы-інтэрната алімпійскага рэзерву Б. А. Ланда, загадчык кафедры рускай мовы і літаратуры Мінскага суворалаўскага вучылішча Г. Г. Зелянчук і многія іншыя падзякавалі выкладчыкам і супрацоўнікам філфака за арганізаваную сустрэчу, за тыя веды, што даў ім факультэт.

**А. ВЕРАСАЎ.**

МЫ — ШЭФЫ

## НА МОВЕ ДРУЖБЫ

ГРАМАДСКАЯ работа — неад'емная частка жыцця кожнага камсамольца. Гэта добра разумеюць будучыя педагогі — студэнты IV курса 8-й групы механіка-матэматычнага факультэта Галя Сазонава, Люда Лапко, Таня Ліпская, Ніна Бядзінская, Валя Сёміна, Наташа Андрусевіч. Дзяўчаты шэфствуюць над 6-м «А» класам СШ № 67 горада Мінска. Працуюць яны з агеньчыкам, за што і палюбілі іх піянеры.

Шмат цікавых мерапрыемстваў правялі дзяўчаты. Гэта і віктарына па матэматыцы, і гутарка аб старажытных матэматыках, і сустрэча з байцамі СБА, якія едуць на БАМ, і экскурсія ў вылічальны цэнтр БДУ...

А зусім нядаўна адбылася сустрэча з замежнымі студэнтамі. У госці да вучняў прыйшлі студэнты 3-га курса механіка-матэматычнага факультэта Марсел Комана і Клосцер Авіан Банімі з Гвінеі. З вялікай цікавасцю слухалі школьнікі аб геаграфічным становішчы Гвінеі, аб жыцці гвінейскага народа ў час каланіяльнай залежнасці і ў нашы дні, аб флоры і фаўне краіны, аб карысных выкапнях. Потым Клосцер і Марсел чыталі вершы на сваёй роднай мове, адказвалі на пытанні.

Класны кіраўнік Марыя Восіпаўна Мазанік, якая таксама з цікавасцю, як і вучні, слухала выступленне гвінейскіх студэнтаў, сардэчна падзякавала гасцям. Школьнікі уручылі ім памятныя сувеніры.

...Шмат цікавых спраў у вучняў наперадзе, і кожны раз з нецярпеннем чакаюць яны сустрэчы са сваімі старэйшымі таварышамі.

**В. МАСТЫКА,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта.**

## АГІТБРЫГАДЫ — НА МАРШЫ

КОНКУРС дзіцячых агітбрыгад падшэфных школ і домакіраўніцтваў Белдзяржуніверсітэта адбыўся ў час вясновых канікул. Гэта была своеасаблівая справаздача работы студэнцкіх педагагічных атрадаў за вучэбны год. Найбольш цікавую праграму прадставіла агітбрыгада «Беларусачка» сярэдняй школы № 9, над якой шэфствуе камсамольская арганізацыя філалагічнага факультэта. Дружнымі апладысментамі ўзнагародзілі гледачы ўдзельнікаў танцавальнага ансамбля, які выканаў танцы «Кукла», «Казачок», «Тройка», «Цыганачка» і іншыя. Спадабалася і літаратурна-драматычная кампазіцыя ў выкананні гэтай агітбрыгады. З цікавай праграмай выступіла таксама агітбрыгада домакіраўніцтва № 53, дзе шэфамі з'яўляюцца студэнты механіка-матэматычнага факультэта.

Трэба адзначыць, што ў аглядзе не прынялі ўдзелу выхаванцы гістарычнага, фізічнага, юрыдычнага факультэтаў, адсутнасць якіх наўрад ці апраўдальная.

Лепшым агітбрыгадам і асобным выканаўцам на урачыстасцях, прысвечаных 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, будуць уручаны граматы камітэта камсамола універсітэта і каштоўныя падарункі.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**

# НК СТРАНИЦА №5 КОМИТЕТА НАРОДНОГО КОНТРОЛЯ МОСКОВСКОГО РАЙОНА

## В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

МОСКОВСКИЙ районный комитет, группы народного контроля промышленных предприятий осуществляли систематический контроль за ходом развития производства товаров массового спроса.

Районный комитет в июле и октябре 1979 года провел две массовые проверки предприятий района, выпускающих товары народного потребления. Проверками были охвачены 10 предприятий. В их проведении участвовали 31 человек, в том числе 19 народных контролеров. Активное участие в проверках принимали представители райплана и райфинотдела. Материалы проверок рассмотрены на заседаниях комитета и исполкома Московского райсовета народных депутатов.

В результате детального изучения и анализа положения дел по производству товаров народного потребления на предприятиях района были изысканы резервы по выпуску дополнительного количества этих товаров на 2343 тысячи рублей.

Тавары народного потребления, выпускаемые в районе, являются основной, плановой, продукцией. Все предприятия района успешно справились с плановыми и дополнительными заданиями по выпуску товаров народного потребления. План выпуска этих товаров по району в 1979 году выполнен на 102,9 процента. Реализация составила 102,3 процента к плану.

На предприятиях района проводится определенная работа по расширению ассортимента и улучшению качества выпускаемых товаров. Хороших успехов в этом вопросе достиг коллектив кожгалантерейной фабрики имени В. В. Куйбышева. План реализации продукции в 1979 году выполнен на 103,0 процента, значительно перевыполнено дополнительное задание.

На фабрике проводится большая работа по освоению новых видов изделий. В прошлом году запущено в производство 113 новых моделей кожгалантерейных изделий, в том числе 14 с олимпийской символикой. Со Знаком качества производится 93 модели, или 13,9 процента от общего выпуска.

Улучшает работу по производству товаров народного потребления производственное объединение «Луч». В 1979 году выпущено обуви на сумму 65458 тысяч рублей, или на 104,7 процента к плановым заданиям. Объединением проводится значительная работа по увеличению выпуска обуви со Знаком качества.

Хороших результатов по выпуску товаров народного потребления в прошлом году добились коллективы Минской щетино-щеточной и табачной фабрик.

Вместе с тем в работе некоторых предприятий имеется ряд существенных недостатков по производству товаров народного потребления. Кожгалантерейная фабрика не выполняет доведенные задания по выпуску товаров детского ассортимента. Обувное объединение не обеспечивает выпуск обуви в заданной номенклатуре и ассортименте. Не выполняет дополнительное задание щетино-щеточная фабрика.

Значительную помощь коллективам предприятий района, выпускающих товары народного потребления, оказывают народные контролеры. Особенно активную позицию занимают народные контролеры кожгалантерейной фабрики имени В. В. Куйбышева. Головная группа фабрики во втором полугодии 1979 года провела 10 проверок, из них 6, непосредственно касающихся производства товаров народного потребления.

Районный комитет и впредь будет осуществлять контроль за выполнением указаний партии и правительства по увеличению выпуска, расширению ассортимента и улучшению качества товаров народного потребления.

**Л. МАЦКО,**
**председатель комитета НК Московского района.**

● ОПЫТ

## ЗАСЛОН ИЗЛИШЕСТВАМ

В СООТВЕТСТВИИ с решением секретариата ЦК ВЛКСМ в период с октября 1979 года по март 1980 года в комсомольских организациях района проходил Всесоюзный рейд «Комсомольского прожектора» и газеты «Комсомольская правда» по рациональному использованию топлива и энергии в народном хозяйстве. Успешному проведению рейда содействовало то, что районный штаб «КП» провел инструктивное совещание — учебу председателей «КП» первичных комсомольских организаций.

Для проведения рейда были созданы специальные рейдовые бригады, в которые вошли прожектористы, молодые специалисты, работники планово-экономических служб, передовики производства. Цели и задачи рейда пропагандировались через стенную печать и специальные выпуски «Комсомольского прожектора».

Всего штабами и постами «Комсомольского прожектора» было проведено 267 рейдов, в которых приняло участие 1660 человек. По результатам рейдов было выпущено 96 номеров «Комсомольского прожектора», «молний» и «сигналов».

Большая работа была проведена рейдовыми бригадами в период подготовки организаций и предприятий к работе в зимних условиях. Прожектористы не только выявляли недостатки, но и сами активно участвовали в их устранении.

Ими был выполнен значительный объем работ по улучшению теплоизоляции зданий, утеплению окон, ремонту дверей.

Наилучших результатов на этом этапе рейда добились прожектористы ПО «Минмедпрепараты». Они сделали два фотовыпуска «Комсомольского прожектора», которые оказали эффективное воздействие на администрацию предприятия.

При проведении рейдов члены «КП» участвовали в разработке мероприятий по рациональному использованию энергоресурсов. Наиболее эффективной формой работы прожектористов является организация повторных проверок.

Отличительной чертой проведения рейдов является то, что их результаты обсуждались не только на заседании штабов «Комсомольского прожектора», но и на комсомольских собраниях, заседаниях комитета комсомола.

Прожектористами энергоцеха МПОО «Луч» было подано 9 рацпредложений по улучшению работы энергооборудования, повторному использованию конденсата. Их реализация позволила сэкономить 870 квт.-час. электроэнергии, более 18 килограмм условного топлива.

Всего в ходе рейда было подано 34 рацпредложения, сэкономлено 3200 квт.-час. электроэнергии, 45 тонн условного топлива.

Но хотя рейд официально завершился, штабы «КП» не прекратили свою работу по изысканию резервов экономии топлива и электроэнергии. Используя накопленный в ходе рейда опыт, они включились в объявленную Минским горкомом комсомола операцию «Заслон». Главной целью операции является изыскание путей рационального использования рабочего времени. Прожектористы промышленных предприятий и строек района в настоящее время расширяют свое участие в объявленном газетой «Комсомольская правда» рейде «Поезд комсомольской бережливости».

**Г. БЕЛЕВИЧ,**
**председатель районного штаба «Комсомольского прожектора».**

● СИГНАЛ УСЛЫШАН

## ФАКТЫ ПОДТВЕРДИЛИСЬ

К НАРОДНЫМ контролерам поступило письмо, в котором указывалось, что на Минском заводе «Спецавтоматика» (директор А. П. Каташинский, главный инженер С. И. Ковалев) недостаточно ведется работа по повышению качества выпускаемой продукции. Дозорные провели рейд. И вот что выяснилось.

Руководство завода не создало элементарных условий для нормальной работы ОТК, хотя работники отдела неоднократно обращались по этому вопросу. На заводе отсутствует изолированное помещение для организации проведения входного контроля, годная и бракованная продукция хранится совместно. Допускается порочная практика отпуска готовой продукции, минуя отдел технического контроля.

На низком уровне находится нормативно-техническая документация. Технические условия на ряд изделий не согласованы с органами Госстандарта и имеют нарушения требований ГОСТов.

В отделе технического контроля на некоторые изделия вообще отсутствуют технические условия и технологические процессы.

Качество готовых изделий и техническое обслуживание систем противопожарной автоматики и охранно-пожарной сигнализации находится на низком уровне. В 1979 году на завод поступило 7 претензий на неудовлетворительную работу систем.

Анализ хозяйственной деятельности показал крайне неритмичную работу предприятия.

На заводе имеют место случаи искажения отчетных данных по выпуску продукции в сторону увеличения.

Районный комитет народного контроля потребовал от руководства завода «Спецавтоматика» (А. П. Каташинского, С. И. Ковалева) устранить имеющиеся недостатки.

**В. ОЛЕШКО.**

ОФИЦИАЛЬНЫЙ ОТДЕЛ

## СТРОГО НАКАЗАНЫ

НА МИНСКОМ опытно-механическом заводе Минпромстройматериалов БССР (директор А. А. Иваницкий, главный бухгалтер Г. И. Ильющеня, начальник планово-экономического отдела В. А. Черняк, начальник отдела труда и заработной платы С. А. Багдасарян) имеются серьезные нарушения финансовой и сметной дисциплины.

Заводом допускаются срывы выполнения плана реализации готовой продукции, в то время как остатки ее на складе значительно превышают норматив. Кроме того, предприятием заранее при составлении плана реализации закладываются остатки готовой продукции, на 150—200 тысяч рублей превышающие норматив.

На заводе не производится анализ себестоимости продукции, не контролируется ее рентабельность. В результате этого имеют место факты, когда одно и тоже изделие в одном месяце рентабельно, а в другом убыточно.

Необоснованно завышены в первом полугодии 1979 года выплаты из фонда материального поощрения, входящие в среднюю заработную плату, что повлекло за собой опережение ее роста над темпами роста производительности труда.

По большинству статей сметы фонда материального поощрения на 1979 год отсутствует разбивка сумм по категориям работников. При распределении и выплате единовременной помощи допущены грубые нарушения, не выдержано установленное соотношение выплаченных сумм по категориям работников.

Допущен перерасход фонда материального поощрения.

Имеют место грубые нарушения порядка оплаты за произведенные работы. Зачастую за работы, выполненные в одном месяце, заработная плата выплачивается в последующих месяцах.

За все эти недостатки руководство завода строго наказано.

## Недостатки устраняются

В РЯДЕ проектных и научно-исследовательских институтов допущены нарушения штатно-сметной дисциплины при переходе на новые условия оплаты труда.

В институте «Белместпромпроект» (директор А. М. Гришко, главный бухгалтер И. Ф. Бобров, старший экономист Е. В. Зябко) переход на новые условия труда осуществлен без увеличения объема работ и без сокращения численности работников, а за счет выделенного Госпланом фонда заработной платы.

При отсутствии в действующей схеме окладов для руководителей самостоятельных секторов в штатном расписании утвержден самостоятельный сектор промэстетики, допущены другие излишества. Имеются нарушения в приеме на работу совместителей и оплате за совмещение профессий. Практикуется использование двухпроцентного планового фонда заработной платы на временное (на месяц) повышение должностных окладов группе работников.

В Минском филиале ВНИИСМИ (директор Г. А. Гриневич, старший бухгалтер Г. Н. Тарасик, начальник планового отдела Е. А. Захарова) не обеспечена лимитом предельных ассигнований должность заведующего отделом патентно-лицензионной работы.

В Минском отделении института «Союзгипрострой» (управляющий А. Ф. Борисов, старший бухгалтер Л. М. Ясюкевич, начальник планово-производственного отдела Ф. С. Гинзбург) сверх лимита предельных ассигнований содержится заведующий техническим архивом.

Некоторым работникам отделения при переходе на новые условия оплаты труда были установлены завышенные должностные оклады. Имеются отдельные излишества в утвержденной структуре отделения.

В Белорусском филиале государственного научно-исследовательского энергетического института имени Кржижановского (директор В. С. Ермаков, главный бухгалтер Л. В. Гулюк, старший экономист О. А. Манько) нарушается порядок использования фонда заработной платы нештатного состава. Недостаточно осуществляется контроль за использованием средств на командировки.

Имеются в филиале существенные недостатки в учете и использовании материалов.

Допускаются нарушения в использовании премиального фонда и оказании материальной помощи. Свыше половины сумм оказанной материальной помощи в 1978—1979 годах приходится на долю руководства филиала.

Районный комитет народного контроля потребовал от руководителей проверенных проектных и научно-исследовательских институтов Г. А. Гриневича, А. М. Гришко, А. Ф. Борисова, И. П. Шпорта, В. С. Ермакова полного устранения всех допущенных нарушений.




# ЗАГАД

**АД 1 КРАСАВІКА 1980 ГОДА**

**ПА КАФЕДРЫ САТЫРЫЧНАГА І ГУМАРЫСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ**

З МЭТАЙ эканоміі часу і павышэння эфектыўнасці працы кафедры ўсім работнікам загадваю:

1. Смяяцца ў строга ўстаноўлены для гэтага час і ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах.
2. Рагатаць (нават усміхацца) больш як траім забараняецца.
3. Забараняецца жартаваць па адрасу тых, з каго смяяцца нетактоўна.
4. Небяспечна смяяцца з тых, хто можа засмяяцца сам.
5. Апошняму смяяцца катэгарычна забараняецца.

**Лабарант ПІСУЛЬКІН,**
**в. а. загадчыка кафедры.**

## Прадмова

*БЫВАЕ ТАКОЕ. Нарадзіўся 1 красавіка — і ніхто не верыць, усе прымаюць за жарт. Вось і паспрабуй дакажы, што ты ёсць ты. Як аказалася, 1 красавіка—дзень нараджэння факультэта прыкладной матэматыкі. Але ніхто не верыць гэтаму. «Дапамажыце!» — звярнуліся да нас з факультэта. — «Запрашальныя білеты застаюцца. Таму не выпадкова сёння з вышыні нашай кафедры выступаюць рэдактар факультэцкай газеты «Алгарытм» Наталля Кардзевіч і загадчык аддзела сатыры і гумару газеты Генадзь Шаблоўскі.*



Без слоў.

● НАТАТКІ

# ПЕРШАКРАСАВІЦКІ ЮБІЛЯР

НАШАМУ факультэту 10 год. А што датычыць дня нараджэння, дык яго мы не выбіраем. Факультэту «пашанцавала» з днём нараджэння. 1 красавіка — гэта дзень смеху, жартаў. Таму ўсё, чым «радуюць» выкладчыкаў студэнты у гэты дзень, застаецца беспакараным.

У падрыхтоўцы да святкавання дня нараджэння прымаюць удзел усе студэнты, якія любяць свой факультэт. Праграма правядзення дзён ФПМ звычайна вельмі насычана. Спартыўныя спаборніцтвы паміж студэнтамі і выкладчыкамі (шашкі, шахматы, футбол, валейбол), навуковая канферэнцыя...

Апагеем дзён ФПМ становіцца прэс-канферэнцыя. Якія тут разгараюцца страсці! Студэнты прыпамінаюць выкладчыкам усё! Задаюць розныя пытанні, нават асмельваюцца жартаваць (бо 1-е ж красавіка). Гэта, напэўна, самае любімае мерапрыемства студэнтаў (чаго не магу сказаць аб выкладчыках).

І закачваецца святкаванне першакрасавіцкім вечарам. Трэба сказаць, што ўсе такія вечары праходзяць вельмі добра. Набыць білеты — складаная праблема. Прывілеі толькі ў першага курса. І таму ім трохі лягчэй. На гэтым вечары адбываецца пасвячэнне ў студэнты, тут першакурснікі даюць урачыстую клятву вернасці прагамісцкай брацці, тут упершыню гучыць гімн ФПМ.

...Сціхае музыка. Патухае святло. Зачыняюцца дзверы. Разыходзяцца выкладчыкі, студэнты і нашы госці. Да нас, каб адзначыць разам свята, прыязджаюць госці з Ленінграда, Вільнюса, Ерэвана, Гродна, Гомеля, Варонежа. Яны пакідаюць нам свае цёплыя водгукі і пажаданні, а вязуць з сабой нашы жарты, сувеніры, вясёлы настрой, прыемныя ўражанні аб нашым факультэце.

Ды і мы, гаспадары факультэта, надоўга запамінаем гэтыя дні.

1980 год — юбілейны для нашага факультэта. Думаю, што дні святкавання 10-годдзя ФПМ упішуцца чырвонымі літарамі ў гісторыю нашага любімага факультэта.

**Н. КАРДЗЕВІЧ,**
**студэнтка II курса ФПМ.**

**P. S. Кафедра сатырычнага і гумарыстычнага аналізу далучаецца да ўсіх віншаванняў, якія паступілі ў адрас ФПМ. Шчыра віншуе юбіляра без усякіх скідак на першакрасавіцкае паходжанне.**

● КАЗКА

# ЧАРОЎНЫ ПАРТФЕЛЬ

ВУЧЫЎСЯ некалі ў нас адзін студэнт. Звычайны студэнт — толькі вось прозвішча ў яго было вельмі гучнае—Аладзінаў. Таму часта перачытваў ён усходнія казкі, марыў аб чароўных прыгодах. Верыў Аладзінаў, што і з ім адбудзецца нешта незвычайнае, казачнае.

Аднойчы атрымаў па пошце пасылку, а ў ёй — партфель. Уразіў Аладзінава зваротны адрас пасылкі: Бухара, тав. Джынаву.

Прынёс ён партфель дамоў. Адкрыў, а там нічога няма. Засмуціўся Аладзінаў, паставіў партфель у вугал і пачаў рыхтавацца да экзамена. Але надта ж сумнай была навука. Так і заснуў Аладзінаў за сталом. І чуецца яму, што шэпча нехта: «Стукні два разы па партфелю і які хочаш канспект адтуль даставай».

Усхапіўся Аладзінаў і да партфеля. Пастукаў па яму і гаворыць: «Хачу канспект па свайму нелюбімаму прадмету, ды не просты, а з далонь памерам, у паўсантыметра таўшчынёй, ды каб кожнае пытанне на асобным лістку». Адкрыў партфель. Пуста. Перавярнуў яго — выпаў канспекцік, ды такі добры—і з далонь, і ў паўсантыметра, і кожнае пытанне на асобным лістку...

Як здаваў Аладзінаў свой нелюбімы прадмет, нам невядома, ды толькі адзнаку атрымаў ён выдатную.

Ну з таго часу і пайшло, і пайшло. Да пятага курса патрапаўся партфель, але служыў добра. Такую дыпломную работу выдаў, што з усіх факультэтаў чытаць прыходзілі—так добра напісана была яна.

Ды толькі калі прыйшоў былы студэнт Аладзінаў на работу, разладзілася нешта ў партфелі. Сшыткі то выдае, але больш звычайных разы ў тры і таўсцей разы ў чатыры, а на лістках нічога не напісана. Можа разладзілася што ў партфелі, а можа...

Відаць, казкі збываюцца толькі на студэнцкай парце. А выйшаў за парог факультэта з дыпломам, і... нават партфель не дапамагае — патрэбны веды.

**Г. ШАБЛОЎСКІ,**
**студэнт ФПМ.**

**ЛІРАНІЗМЫ**

## Дужа выйграў

У адчайнай скрусе
Прысвячаў ёй вершы.
А яна на курсе —
Прыгажуняй першай.

Ды свайго кахання
Не паказваў хлопец,
Думаў:
«Ей прызнанняў
І ад іншых хопіць».

А дзяўчына смела
Падышла аднойчы
І з вясёлым смехам
Зазірнула ў вочы.

—Я цябе кахаю,—
Прашаптала словы.
Быў пачатак маю,
Плыў дурман вясновы...

Не ўспрыняў сур'ёзна,
Не сцярпеў насмешкі...
Адзвінелі вёсны,
Разышліся сцежкі.

А затым — сустрэча.
Слоў, як шчасця, мала...
—Я цябе, дарэчы,
Сапраўды кахала,—

Паглядзела з сумам,—
І цяпер кахаю...
Ну а ён падумаў:
«Бач ты, дарагая!—

Не паверыў — сам жа
Тут я выйграў дужа:
Дзесяць год як замужам —
Не кахае мужа!..»

**А. УСЕНІН.**

## ДЫЯЛОГІ

ЕЎКЛІДА аднойчы спыталі:
— Што б вы лепш узялі — два цэлыя яблыкі ці чатыры палавінкі?
— Канешне, чатыры палавінкі...
— Чаму, гэта ж адно і тое ж?
— Не адно. Узяўшы два цэлыя яблыкі, як я даведаюся, чарвівыя яны ці не...

* * *

НЕ МАГЛІ б вы, прафесар, сказаць, куды я траплю, калі з гэтай залы, напрыклад, прасвідрую адтуліну скрозь зямлю?—спытаў аднойчы на лекцыі студэнт вядомага нямецкага геолага Гелера.
— Магу,—адказаў прафесар.—Вы трапіце прама ў псіхіятрычны лазарэт.

* * *

ВЯДОМЫ фізік Генрых Геру у маладосці захапляўся такарнымі работамі. Калі майстар, які навучаў яго гэтай справе, праз шмат гадоў даведаўся, што Геру стаў прафесарам, ён заўважыў:— З яго выйшаў бы нядрэнны токар.

**Падслухаў дыялогі**
**Шура ШПОРА.**

# ДУМКІ ЎСЛЫХ

— Ці набывае карысны вопыт той, хто б'е галавой аб сцяну?
— Ці можна пачаць жыццё з сярэдзіны?
— Ці павінен у барацьбе з самім сабой перамагаць мацнейшы?
— Не ўсё золата, што маўчыць.
— Перш чым нічога не рабіць, добра ўзваж свае магчымасці.
— Быць настойлівым часта перашкаджае ўпартасць.

**Думаў дацэнт НЕЗАЛІКІН.**

**ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ**




## АБ'ЯВЫ

**ПАВАЖАНЫЯ чытачы кафедры сатырычнага і гумарыстычнага аналізу! Зразумейце нас правільна. Сённяшні першакрасавіцкі нумар «КГ і СА» выходзіць 3 красавіка. І не лічыце, калі ласка, двухдзённае спазненне першакрасавіцкім розыгрышам. Гэта ўсяго толькі выдаткі тэхналогіі.**

**З павагай в. а. загадчыка кафедры лабарант ПІСУЛЬКІН.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
АТ 10617 Заказ 545.
3 красавіка 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ